## Шведскі піяніст Роберт УЭЛС:

# «ЯК НЕ БУДЗЕ РАСПРАНАННЯ? ЯНЫ МНЕ АБЯЦАЛІ!»

Літаральна днямі стала вядома, што беларускаму гурту «3+2», які прадставіць Беларусь на сёлетнім песенным конкурсе «Еўрабачанне», акажа падтрымку ўжо вопытны артыст, больш за тое, чалавек з гучным імем на еўрапейскай музычнай сцэне — шведскі піяніст і кампазітар Роберт Уэлс.

Натуральна, гэта навіна адразу выклікала мноства пытанняў: чаму беларускія арганізатары абралі менавіта гэту кандыдатуру, што зацікавіла самога музыканта з кансерваторскай адукацыяй у магчымасці выступіць на «Еўрабачанні», як наяўнасць шостага ўдзельніка скарэктуе конкурсны нумар, і ці не ўспрымуць у Швецыі выступленне Уэлса з беларускай камандай як дэмарш? Пра ўсё гэта пагадзіўся расказаць беларускім журналістам сам Роберт Уэлс, хоць і прыляцеў у Мінск усяго на дзень, літаральна дзеля «жывога» знаёмства і першага сумеснага выступлення з салістамі гурта «3+2».



Нават маленечкага імправізаванага канцэрта ў холе гасцініцы «Еўропа» нам хапіла, каб ацаніць не толькі найвышэйшы клас Роберта-музыканта, але таксама харызму, тактоўнасць і пачуццё гумару заходняга госця.

Штогадовае канцэртнае шоу Уэлса «Рапсодыя ў стылі рок» вось ужо 15 год як выклікае цікавасць у публікі ва ўсім свеце — ад Ізраіля да Кітая, ад Афганістана да ЗША (толькі ў Швецыі яго наведалі больш за 1,5 мільёна чалавек!). А вось у Беларусі кампазітар раней ніколі не бываў, але тое-сёе пра нашу краіну ведаў:

— У мяне захаваліся ўспаміны, як некалькі гадоў таму, у 2002 годзе на Алімпіядзе Беларусь абыграла каманду Швецыі па хакеі. А я мала таго што вялікі фанат хакея, дык яшчэ і пісаў музыку да гэтага чэмпіянату. Натуральна, для ўсіх нас гэта была вельмі-вельмі сумная падзея, — заразліва ўсміхаецца. — А ўвогуле, шмат чаго залежыць ад першага ўражання. Хоць я і правёў тут усяго дзень, але пачуцці, якія я перажыў ад візіту ў Беларусь, былі выключна станоўчымі: калі вылятаў са Швецыі, там было мінус 5, а ў вас амаль што лета, цёпла, і ўсе шчаслівыя — мне гэта вельмі спадабалася.

— Вы толькі днямі пазнаёміліся з нашымі выканаўцамі і адрэпеціравалі з імі «жыўцом». Якія ўражанні засталіся ад знаёмства — можа, чагосьці маладым салістам не хапае, над чымсьці варта папрацаваць?

— Мне здаецца, больш важна казаць не пра тое, якія ўражанні ў мяне пакінулі гэтыя маладыя артысты, а пра тое, як мы спрацуемся і якое ўражанне мы ўсе разам, выходзячы на конкурсную сцэну, пакінем у сэрцах еўрапейскіх слухачоў. Гэтым разам мы паспелі ўсяго некалькі хвілін пагаварыць у грымёрцы, але ў нас яшчэ будзе шэраг сумесных рэпетыцый, у тым ліку ў Осла, і я ўпэўнены: чым больш часу мы будзем зладжана працаваць, тым больш камфортна адчуем сябе адзін з адным. Думаю, мы зробім выдатнае шоу, сыграем гэту песню здорава. Для мяне вялікі гонар паўдзельнічаць у гэтым праекце, і я зраблю ўсё магчымае, каб Беларусь набрала як мага большую колькасць балаў.

Чым жа прыцягнула ўвагу шведскага музыканта прапанова беларусаў? «У песні «Butterflies» чутныя элементы класічнай музыкі, а я люблю, калі ў кампазіцыі ёсць такія элементы, рок-песня гэта ці балада. Таму незалежна ад таго, стварылі б мы гэтую песню да «Еўрабачання» або пасля, я ў любым выпадку з задавальненнем удзельнічаў бы ў гэтым праекце».

— Але ж мы прызвычаіліся, што для выступлення на «Еўрабачанні» патрэбна шоу — каб нехта распранаўся на сцэне, лягалі анёлы, што-небудзь узрывалася... Вас не засмучае, што нічога гэтага ў беларускім нумары няма?

— Як гэта не будзе распранання? — з прытворным абурэннем перапытвае Роберт. — Мне ж абяцалі! *(Смяецца)*. Песня эфектная сама па сабе, здольная выклікаць у людзей моцныя эмоцыі, і гэта, на мой погляд, самае галоўнае. Таму ёй не патрэбныя ніякія спецэфекты. Калі б яны былі, я адмовіўся б у гэтым удзельнічаць. Давайце пакінем увесь гэты экшн на наступны раз.

На журналісцкія падколкі, маўляў, ці не баіцеся, што ў роднай краіне ваша выступленне з беларускай камандай успрымуць як здраду, піяніст адказвае нечакана сур'ёзна: «Не, з гэтым не будзе ніякіх праблем, наадварот, усе будуць вельмі рады. У Швецыі на гэтым конкурсе ёсць толькі адзін адвечны сапернік — Нарвегія, і калі б я выступаў з нарвежцамі, то мае суайчыннікі маглі б раззлавацца; а калі наступны конкурс будзе праходзіць у Мінску — гэта ж выдатна!». Дарэчы, Швецыя традыцыйна надае «Еўрабачанню» вялікую ўвагу: напрыклад, сёлета, каб мець гонар прадставіць сваю краіну, у адборы спаборнічала больш за 3 тысячы песень! Але поспех, перакананы музыкант, не залежыць ад таго, адкуль ты родам. Узяць хоць бы гісторыю яго запрашэння ў беларускую каманду: расійскі прадзюсар Макс Фадзееў звязаўся са шведскім піяністам і кампазітарам праз нямецкага імпрэсарыа Максіма Берына (родам, між іншым, з Беларусі).

Цікавая дэталь: адміністратыўная і творчая група, якая займаецца падрыхтоўкай нашых удзельнікаў да «Еўрабачання», спачатку збіралася «змясціць» на конкурснай сцэне шостага ўдзельніка віртуальна, з дапамогай складанай сістэмы праектараў і люстэркаў. Але нарвежскія арганізатары паведамілі, што ў іх наўрад ці будуць тэхнічныя магчымасці для такой пастаноўкі, і ад ідэі давялося адмовіцца. Цяпер рабочая версія — даволі статычная пастаноўка, пяцёра выканаўцаў і піяніст. Роберт па сакрэце прызнаўся, што бачыць у нумары стрыманыя класічныя ўборы і такі ж інструмент, напрыклад, белы антыкварны раяль. Ці падзяляюць яго пункт гледжання арганізатары? Даведаемся ўжо зусім хутка...

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**